Источник: **«Звязда» - 2012-11-23**

## Падарунак міністра славутаму Цэнтру

**Днямі ["Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па земляробстве"] ўрачыста адзначыў 85-годдзе з дня заснавання. З гэтай нагоды ў Жодзіне адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная праблематыцы развіцця айчыннай селекцыі.**

Павіншаваць калег і сяброў прыехалі прадстаўнікі роднасных устаноў і інстытутаў з Расіі, Украіны, Казахстана, Сербіі, Літвы, Латвіі. Вядома, шмат было гасцей з рэгіёнаў Беларусі і асабліва з Мінскай вобласці. Безумоўна, у пэўным сэнсе яе прадстаўніком можна лічыць міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца, які вырас з радавога агранома і сфарміраваўся як кіраўнік высокай кваліфікацыі (як цяпер называюць, топ-менеджар), менавіта ў Мінскай вобласці. Дарэчы, як і цяперашні кіраўнік Цэнтра па земляробстве, доктар сельскагаспадарчых навук Фёдар Прывалаў. Ён патомны хлебароб, доўгі час быў старшынёй адной з лепшых гаспадарак на Міншчыне, потым узначальваў Нясвіжскі райвыканкам. Удала спалучаў практычную работу з навуковымі даследаваннямі па актуальных праблемах аграрнага сектара.

Віншавальная прамова Леаніда Зайца была нядоўгай і насіла хутчэй праграмны характар для калектыву Цэнтра. У прыватнасці, падкрэслівалася важная роля нашых навукоўцаў-селекцыянераў у развіцці экспартнага патэнцыялу аграрнага комплексу краіны, папаўненне яе золатавалютных запасаў, забеспячэнне харчовай бяспекі дзяржавы. Леанід Канстанцінавіч зазначыў, што супрацоўнікам Цэнтра па плячы вырашэнне новых адказных задач, бо папярэднімі пакаленнямі яго вучоных-даследчыкаў закладзены трывалы падмурак для далейшага росту.




І сапраўды, зроблена за мінулыя дзесяцігоддзі нямала. Абсалютная большасць палёў цяпер засяваецца насеннем айчыннай селекцыі, якое дае фору замежным аналагам. Беларускія сарты лепш прыстасаваны да прыродна-кліматычных умоў нашай краіны,

больш стойкія да хвароб і ўзрушэнняў надвор'я. Няўхільна расце колькасць створаных навукоўцамі Цэнтра сартоў раслін, яны паспяхова культывуюцца ў Расіі, Украіне, іншых краінах СНД. Напрыклад, выведзены сарты азімай і яравой пшаніцы, якія не саступаюць замежным, а па некаторых характарыстыках і пераўзыходзяць іх. Увогуле ўсе зарэгістраваныя апошнім часам сарты маюць высокі ўзровень прадукцыйнасці. Патэнцыял збожжавых — больш чым 100 цэнтнераў на круг, зернебабовых — 60, рапсу — 50 цэнтнераў з гектара. Заўважым, што шлях новага перспектыўнага сорту з лабараторыі, доследнай дзялянкі на палі гаспадарак даволі доўгі і не факт, што ён апраўдае ўсе надзеі яго стваральнікаў. Ім нярэдка перашкаджае старое мысленне, неразваротлівасць і празмерная абачліваць часткі кіраўнікоў агракомплексу, тэхналагічная і тэхнічная адсталасць яшчэ значнай колькасці гаспадарак і інш.

Нельга не ўзгадаць унёсак Цэнтра ў забеспячэнне айчынных піваввараў беларускай сыравінай, што дазволіла ім эканоміць многія мільёны долараў штогод. Менавіта ў Жодзіне былі створаны півaварныя сарты ячменю "Бурштын" і "Бровар". Сарты ячменю беларускай селекцыі пераўзыходзяць польскія і нямецкія па ўраджайнасці на 11—21 цэнтнер з гектара. Утрыманне бялку ў іх на 1,5—2 працэнты ніжэй, што вельмі важна для прыгатавання смачнага піва.

Можна яшчэ доўга пералічваць дасягненні і здабыткі навукоўцаў і спецыялістаў Цэнтра. Скажам, нагадаць пра цесныя сувязі з навукоўцамі не толькі постсавецкіх рэспублік, а і Германіі, Швейцарыі, Балгарыі, Даніі, Польшчы. З замежнымі калегамі ідзе актыўны абмен навуковай інфармацыяй і селекцыйнымі матэрыяламі, праводзяцца сумесныя даследаванні. Невыпадкова за межамі нашай краіны беларускія сарты і гібрыды займаюць 2 мільёны гектараў. Ці вось цікавы факт: упершыню ў гісторыі Беларусі створаны айчынныя гібрыды кукурузы. Гэта своеасаблівы прарыў у раслінаводстве.

Аднак, на думку Леаніда Зайца, айчынныя селекцыянеры здольныя на большае. І для больш прадметнай размовы на гэтую тэму запрасіў кіраўніцтва Цэнтра да сябе ў міністэрства. А ў якасці падарунка ад ведамства ўручыў карціну.

**Леанід Тугарын**

г. Жодзіна